**Шумінскі, А.** Полк быў падняты па трывозе / А. Шумінскі // Герой працы (Шуміліна). — 2012. — 14 лют. — С. 4.

## ПОЛК БЫЎ ПАДНЯТЫ ПА ТРЫВОЗЕ



*15 лютага Беларусь адзначыць 23-ю гадавіну вываду савецкіх войскаў з Афганістана. У гэты дзень ёсць пра што ўспомніць работніку Шумілінскага аддзялення Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь Мікалаю Калянковічу...*

У той час Мікалай служыў у войсках сувязі Маскоўскай ваеннай акругі памочнікам камандзіра ўзвода. У адзін з лютаўскіх дзён 1980 года полк, дзе ён праходзіў службу, быў падняты па трывозе і накіраваны для аказання дапамогі народу Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан. Маладыя і здаровыя, вясёлыя і задорныя, яны і не падазравалі, якія выпрабаванні выпадуць на іх долю. Камандаванне супакойвала: «Дапаможам брацкаму народу, будзеце ахоўваць аб’екты, усё будзе добра».

Але добра на вайне не бывае. А тое, што ў Афганістане ішла сапраўдная вайна, савецкія салдаты зразумелі адразу, як толькі трапілі на афганскую тэрыторыю. Сяржант Мікалай Калянковіч разам з баявымі сябрамі займаўся аховай ваенных аб’ектаў, наладжваннем сувязі, не аднойчы даводзілася рызыкаваць жыццём, за што адзначаўся камандаваннем і атрымаў пазачарговае званне старшыны ад камандуючага Туркестанскай ваеннай акругі.

Пасля Афганістана Мікалай Аляксандравіч выбраў службу ў органах унутраных спраў. З 1991 года служыў у аддзяленні пазаведамаснай аховы пры Шумілінскім РАУС. Камандзір аддзялення шмат увагі надаваў выхаванню асабістага саставу, у вялікай ступені гэтаму садзейнічаў яго ваенны аўтарытэт.

І пасля адстаўкі прапаршчык Мікалай Калянковіч працуе ў родным калектыве, сёння ён дзяжурны пульта кіравання.

**Д. Шумінскі,**

начальнік Шумілінскага аддзялення Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь